ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
_______________ А.Б.Заблоцкі
"1" кастрычніка 2024 г.

**ЗАДАННІ**
**для правядзення рэспубліканскай алімпіяды**
**па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"**

**КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА З ЭЛЕМЕНТАМІ ВОДГУКУ**

Дата правядзення: 19 кастрычніка 2024 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 14.00.

**XI клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 8 | 9 | 4 | 8 | 12 | 12 | 10 | 8 | 9 | 20 | 100 |

**Заданне 1.** У наступных прыказках выберыце правільны варыянт вымаўлення выдзеленых слоў (падкрэсліце). Націскныя галосныя ў транскрыпцыі выдзелены тоўстым шрыфтам.

*Максімальная колькасць балаў – 8.*

Добраму **госцю** [г**о**с'ц'у] [г**о**сц'у] вароты самі **расчыняюцца** [расчын'**а**йуцца] [рашчын'**а**йуцца].

**Кошцы** [к**о**шцы] [к**о**сцы] жарты – **мышцы** [м**ы**шцы] [м**ы**сцы] **смерць** [с'м'**э**рц'] [см'**э**рц'].

У роднай **староначцы** [стар**о**начцы] [стар**о**наццы] птушкі пяюць, а ў чужой старонaчцы часта **слёзы** [с'л'**о**зы] [сл'**о**зы] **льюць** [л'л'**у**ц'] [л'й**у**ц'].

І печанае **рэдзькі** [р**э**дз'к'і] [р**э**ц'к'і] **з'ясі** [з'йас'**і**] [зйас'**і**], як **згаладаешся** [згалад**а**йэс'с'а] [сгалад**а**йэс'с'а].

Гаспадарку **весці** [в'**э**с'ц'і] [в'**э**сц'і] – **не лапці** [н'ал**а**пц'і] [н'эл**а**пц'і] **плесці** [пл'**э**сц'і] [пл'**э**с'ц'і].

**Дзве** [дз'в'**э**] [дв'**э**] работы за раз **не зробіш** [н'эзр**о**б'іш] [н'азр**о**б'іш].

**Заданне 2.** Раздзяліце наступныя словы на марфемы, размясціўшы іх у асобных ячэйках табліцы. Памятайце пра існаванне нулявога канчатка, у патрэбнай графе пазначайце "нулявы".

*Максімальная колькасць балаў – 9.*

| Словы | Прыстаўка | Корань | Суфікс (ы) | Канчатак | Постфікс |
|---|---|---|---|---|---|
| **Узор:** *перацягванне* | *пера-* | *-цяг-* | *-ва- -нн-* | *-е* | - |
| пераможна | | | | | |
| плагіятар | | | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| разносчыца | | | | | |
| рагледзецца | | | | | |
| журботнасць | | | | | |
| бязвінны | | | | | |
| адлюстраванне | | | | | |
| усямёх | | | | | |
| ухабісты | | | | | |

**Заданне 3.** У нашай краіне ёсць цудоўная традыцыя: у першыя выхадныя дні верасня адзначаецца Дзень беларускага пісьменства. Цэнтрам свята становіцца невялікі горад, значны ў культурных адносінах. Там ладзяцца кніжныя выставы, конкурсы, сустрэчы пісьменнікаў з чытачамі і многія іншыя мерапрыемствы, якія наведваюць госці. У якім горадзе ўпершыню адзначаўся Дзень беларускага пісьменства ў 1994 годзе? ___________________ У якім горадзе прайшло свята сёлета? ___________________________. Назавіце фанетычныя асаблівасці беларускай мовы, якія ёсць у гэтых дзвюх назвах гарадоў.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| **Назва горада, дзе адзначаўся Дзень беларускага пісьменства** | **Фанетычная асаблівасць беларускай мовы ў назве** |
|---|---|
| 1994 год | |
| 2024 год | |

**Заданне 4.** Фіналь (канцавая частка слова) *-ня* ўласціва многім назоўнікам сучаснай беларускай мовы. Прывядзіце словы з гэтай фіналлю, якія адпавядаюць акрэсленым у табліцы лексічным значэнням.

*Максімальная колькасць балаў – 8.*

| **Лексічнае значэнне слова** | **Слова з фіналлю *-ня*** |
|---|---|
| Крама, у якой прадаюцца кнігі | |
| Спецыяльнае месца, дзе можна пагаліцца, пастрыгчыся, пафарбаваць валасы, зрабіць новую прычоску | |
| Спецыяльнае памяшканне для коней | |
| Месца, дзе штосьці майструюць або рамантуюць | |
| Прадпрыемства, дзе друкуюць кнігі і іншую падобную прадукцыю | |
| Прадпрыемства, на якім вырабляецца цэгла | |
| Спецыяльнае памяшканне, дзе мыюцца і парацца | |
| Калодзеж | |

**Заданне 5.** Замяніце наступныя фразеалагізмы адным словам і ўкажыце, з якой часцінай мовы суадносіцца кожны з іх.

*Максімальная колькасць балаў – 12.*

| Фразеалагізм | Слова, якое тлумачыць значэнне фразеалагізма | Часціна мовы, з якой суадносіцца фразеалагізм |
|---|---|---|
| грэць рукі | | |
| у чорта на рагах | | |
| пайсці да Абрама на піва | | |
| даць лататы | | |
| як зорак на небе | | |
| слабы пол | | |

**Заданне 6.** Пастаўце націскі ў наступных словах.

*Максімальная колькасць балаў – 12.*

Паніч, прывід, фетыш, цыган, знахар, жалюзі, шарсцяны, грамадзянін, трапеза, індустрыя, дачырвана, чаравікі.

**Заданне 7.** Перакладзіце наступны тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 10*

Гусь был велик и на редкость красив, всем видом демонстрировал независимость, уверенность в себе и умение за себя постоять. От него пахло сараем, где он коротал ночлег с утками и курами. Поэтому поставили его в ванну и стали мыть под дождиком. Он помогал нам: своей длинной шеей, словно мочалкой, долго тёр оперение и вышел из ванны белоснежной важной птицей. А потом вдруг развернул крылья и с такой силой заколотил ими в воздухе, что люстра в комнате закачалась *(Паводле Л.Ламсадзэ).*

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

**Заданне 8.** Як вядома, беларускія назвы месяцаў надзвычай паэтычныя. Устаўце адпаведныя словы ў наступны ўрывак з верша народнага паэта Беларусі. Назавіце імя аўтара і сам верш.

*Максімальная колькасць балаў – 8.*

Аўтар____________________________Назва______________________________________

…Толькі месяцаў назвы пакіньце,
Назвы родныя роднай зямлі,
Пра якія з маленства ў блакіце
Бор шуміць і пяюць жураўлі:
_____________— з казкамі снежных аблокаў,
_____________— шчодры на сіні мароз,
_____________— з сакатаннем і сокам
Непаўторных вясновых бяроз,
_____________— час маланак і ліўняў,
_____________— з першым каханнем, сяўбой,
_____________— з ягаднаю зарой,
_____________ — з мёдам,
З пшаніцаю —_____________,
Спелы яблычны_____________,
Светлы ___________________
У празрыстасці чыстай, крынічнай,
_______________— залаты лістапад,
______________— першы густы снегапад...
Ці плачу я, ці пяю,
Ці размаўляю з матуляю —
Песню сваю, мову сваю
Я да грудзей прытульваю.

**Заданне 9**. Укажыце аўтараў кожнага з персанажаў і прывядзіце назвы твораў, героямі якіх яны з'яўляюцца, а таксама жанравую прыналежнасць гэтых твораў.

*Максімальная колькасць балаў – 9 .*

| **Персанаж** | **Аўтар** | **Назва твора** | **Жанр** |
|---|---|---|---|
| Аліндарка | | | |
| Бандароўна | | | |
| Кручкоў | | | |
| Гарлахвацкі | | | |
| Андрэй Беларэцкі | | | |
| Славік Шыковіч | | | |

**Заданне 10**. Напішыце міні-водгук (да 15 сказаў, 3 абзацы) на наступны паэтычны твор.

*Максімальная колькасць балаў – 20.*

**Балада Буйніцкага поля**
Памяці К. Сіманава

За полем поле, як за словам слова
У спеве аб свяшчэнным, дарагім.
Ёсць Барадзінскае, ёсць Кулікова,
І – гэтае, вядомае не ўсім.
О, поле бою,
Буйніцкае поле,
Дарога, дрэўцы, ўскрайчык травяны,
З трывогаю, з сваім глыбінным болем
Ты ўсё яшчэ вяртаешся з вайны.
Над долам неба ў выбухах пяклося,
Абвальваўся і падаў Магілёў.
Уздрыгвае прыціхлае калоссе,
Ў цішы дасюль не ўлёгся гул баёў.
Даўно пярэдні край жніва не дзеліць,
Ды бой жыве, стралковы полк жыве.
Варожых танкаў колькі!..

Трыццаць дзевяць
Старчма гарацць на горасным жніве.
Знікаюць дрэвы, птушкі палявыя,
Дняпром сплывае плач маладзіка.
"Мы будзем тут стаяць, пакуль жывыя", -
Сказаў Куцепаў, камандзір палка.
Паэт узлётам бітвы прычасціўся
(Пасля раскажа свету пра яе);
Узяў свой штык і вернасць пабрацімству
Засведчыў подпісам на валуне…
…Перад дарогаю пад гул матораў
Скаціўся з поля камень, а на ім
Той самы подпіс – франтавы аўтограф
Палку Куцепава і нам, жывым.

Спыніцеся, мой боль, мой смутак, – пастаім.

*Аляксей Пысін*, 1980 год*

***Даведка**. Аляксей Пысін (1920-1981) – пісьменнік-франтавік з Магілёўшчыны.*